## *Незвычайнае спатканне ( на Пасху)*

***Лектар:*** Запрашаем сёння, ўсіх тут прысутных, на штосьці незвычайнае, на спатканне з кімсьці важным. Вясна надыходзіць. Свет пасля зімы да жыцця абуджаецца, а разам з ім прырода, птушаняты і жывёлы, вялікія і маленькія. На Зялёным Лузе, што знаходзіцца на планеце Зямля, цёплае сонейка завітала і яе жыхароў да жыцця абудзіла. І пачалі там скакаць маленькія зайчыкі ***(музыка, танец зайчыкаў).*** Так сабе радасна скакалі і спявалі, калі пачулі голас залацістых куранятаў *(уваходзяць кураняты)*.

***Куранятка 1:*** Прывітанне вам, маленькія зайчыкі! Што вы так радасна скачаце на зялёным лузе?

***Зайчык 1:*** Прывітанне, прывітанне вам, залацістыя кураняткі! Сонейка цёпла сёння свеціць, цяплом сваім прыроду да жыцця абуджае. Хадзем хутчэй да нас, будзем разам вясну сустракаць!*(кураняткі далучаюцца да танца)*

***Анёл*** *(уваходзіць паціху і лагодна кажа):* Прывітанне вам, маленькія звяркі! Як прыемна вас бачыць такімі радаснымі і вясёлымі! А чаму вы так радуецеся?

***Зайчык 2:*** А прывітанне табе сардэчнае! А ты што, не ведаеш? Бо на нашай планеце Зямля, вясна надыходзіць і ўся прырода да жыцця абуджаецца.

***Куранятка 2:*** Так, так! Вось паглядзі, як сонейка сёння цёпла свеціць. Яно ўсміхаецца нам і на сэрцы весялей.

***Зайчык 3:*** А чаму ты пытаешся?

***Куранятка 3:*** А ты хто?

***Анёл:*** Я – анёл, пасланец з Неба. Бог – Творца планеты Зямля, паслаў мяне да вас, жыхары Зялёнага Луга, з Добрай Навінай.

***Зайчыкі і кураняты*** *(разам):* З Навінай?!

***Куранятка 2:*** Але ж анёлы зімой прыходзяць з Добрай Навінай?

***Зайчык 2:*** Тады святкуем Дзень Нараджэння Езуса! А чаму наш Творца свайго анёла вясной прысылае? Што гэта за Навіна такая?

***Анёл:*** Сядайце сабе зручна, маленькія звяркі, і ўважліва слухайце *(апавядае гісторыю Езуса, словы лектара можна запісаць).* ***Лектар:*** Усё пачалося над Ярданам, дзе Ян Хрысціцель прапаведаваў у пустыні Юдэйскай. Як напісана ў прарока Ісаі: “Вось Я пасылаю Анёла Майго перад аблiччам Тваім, які прыгатуе дарогу Табе. Голас таго, хто кліча ў пустыні: прыгатуйце дарогу Госпаду, праступце сцежкі Яму.” *(Мк1.2-3)* Ян хрысціў і абвяшчаў хрост навяртання дзеля адпушчэння грахоў. Аднойчы Езус прыйшоў да яго і прыняў хрост. А з неба быў голас: “ Ты – Сын Мой улюбёны, у Табе

Маё ўпадабанне.” Гэта казаў наш Творца, Айцец з неба. Ён паслаў Свайго Сына, Езуса, з місіяй на планету Зямля. *(У гэты момант выходзіць Езус і 3-4 рыбакі, ловяць рыбу)*

***Езус** (падыходзіць да рыбакоў):* Ідзіце за Мной! Зраблю вас лаўцамі людзей. *(Мц 4,19)* *(рыбакі пашлі за Езусам)*

***Лектар:*** І хадзіў Езус па ўсёй Галілеі наўкола, навучаючы ў сінагогах іх і прапаведуючы добрую вестку Валадарства, ды аздараўляў людзей ад усякай хваробы і немачы. *(Мц 4, 23-25)* А навучаў іх такімі словамі.

***Езус** (навучае):* Шчасныя ўбогія духам… *( Мц 5, 3-12)* Вы соль – зямлі, вы – святло свету. Так хай свеціць святло вашае людзям, каб яны бачылі вашыя добрыя ўчынкі ды хвалілі Айца вашага, Які ў небе.

***Песня. Езус чыніць цуд уваскрашэння** Лк 7, 11-17. (Некалькі чалавек нясе хлопца, каля яго ідзе маці і плача. Да іх падыходзіць Езус)*

***Езус** (да маці):* Не плач! *(падыходзіць да хлопца і кажа):* Хлопча, кажу табе, устань! *(Хлопец устае і ідзе ўзрадаваны, музыка)*

***Лектар:*** Езус ідзе далей і бачыць чалавека хворага з сухой рукой. *(пар. Мц 12)*

***Езус** (да хворага):* Выцягні тваю руку і будзь здаровы!

***Фарысеі:*** Але сёння субота, дзень святы?! Нельга нічога рабіць!

***Езус :*** Так, сёння субота. Ці выпадае аздараўляць у суботу? Ці будзе сярод вас чалавек, які мае адну авечку, і, калі яна ўваліцца ў роў у суботу, ці ж не возьме ён яе і не выцягне? У колькі разоў даражэйшы чалавек за авечку?

***Фарысеі** (са злосцю):* Як Ён можа не выконваць права? Хто Ён такі?! Трэба з ім штосьці зрабіць, бо дае дрэнны прыклад! Нельга гэта так пакінуць! Яго трэба пакараць!

***Лектар :*** А Езус пайшоў далей і ўбачыў сляпога, які сядзеў пры дарозе, жабруючы. І калі ён пачуў, што гэта ідзе Езус з Назарэту, Які мае моц рабіць цуды, пачаў крычаць. *(пар. Лк 18, 35-43)*

***Сляпы** (крычыць):* Езус, Сын Давідаў, злітуйся нада мной!

***Езус** (да вучняў):* Прывядзіце яго да Мяне. *(да сляпога):* Што хочаш, каб Я зрабіў табе?

***Сляпы :*** Госпадзе, каб я бачыў! ***Езус:*** Праглянь! Вера твая збавіла цябе.

***Лектар :*** І зараз стаў бачыць, ды ішоў за Езусам, славячы Бога. І ўвесь народ, як убачыў гэта, аддаў хвалу Богу. Так ішоў Езус з Сваімі вучнямі і рабіў дабро людзям, навучаючы іх аб любові Нябеснага Айца. Але сярод людзей былі і тыя, што Яго

ненавідзелі. Бо Ён аздараўляў хворых у суботу, рабіў дабро людзям. Гэтыя людзі, якіх звалі фарысеі, знайшлі аднаго з вучняў Езуса, а звалі яго Юда Іскарыёт. Фарысеі дамовіліся з ім на трыццаць срэбранцаў, што выдасць ім свайго Настаўніка. І ад гэтай гадзіны ён шукаў нагоды, каб выдаць Езуса. І вось надышоў дзень праснакоў, у якім належала ахвяраваць Пасху. Пасля Апошняй Вячэры, якую Езус спажыў са Сваімі вучнямі, пашлі на гару Аліўную. *(пар. Мц 26-27)*

***Езус*** *(кажа вучням):* Журботная душа Мая аж да смерці, пабудзьце тут і чувайце разам са Мной. *(Езус адыходзіць.* ***Песня.*** *Езус вяртаецца, а вучні спяць, кажа ім):* Вы яшчэ спіце і адпачываеце; вось надышла гадзіна і Сын Чалавечы будзе выдадзены ў рукі грэшнікаў. Падыміцеся, пойдзем: вось наблізіўся той, хто Мяне выдае.

***Лектар:*** А калі Езус казаў гэтыя словы, прышоў Юда Іскарыёт і пацалаваў Яго. Тады жаўнеры схапілі Езуса і прывялі да Пілата, каб судзіў Яго. Юдэйскі народ крычаў на судзе ў Пілата, каб Езус быў укрыжаваны. Тады Пілат казаў, каб Езуса ўбічавалі і аддалі на ўкрыжаванне. Езус перажыў шмат пакутаў і памёр на крыжы з любові да кожнага чалавека на планеце Зямля.

***Песня на Вялікі Пост. (можа быць відэа сцэны укрыжавання)***

***Зайчык 2:*** І гэта ўсё? Канец гісторыі Езуса!

***Куранятка 2:*** Езус памёр! І гэта ёсць добрая навіна?

***Анёл:*** Але ж не! Гэта яшчэ не канец гісторыі Езуса. Слухайце, што адбылося далей. *(Працяг гісторыі Езуса)*

***Лектар:*** Адзін з вучняў Езуса, Язэп з Арыматэі, адважна ўвайшоў да Пілата і прасіў цела Езуса. Пілат аддаў цела Езуса. Язэп жа купіў плашчаніцу і, зняўшы цела Езуса, абгарнуў плашчаніцай ды паклаў у магіле, што была высечана ў скале, і падкаціў камень да ўваходу ў магілу. Бо надыходзіў суботні дзень. Дзень святы для Юдэйскага народу. *(пар. Мк 16)* І, калі мінула субота, Марыя Магдалена, і Марыя Якубава, і Саламея накуплялі духмянасцяў, каб пайсці і намасціць Езуса.

***Пасхальная песня.*** *(Жанчыны ідуць да магілы і размаўляюць паміж сабой)*

***Марыя:*** Хто нам адкоціць камень ад уваходу ў магілу?

***Саламея*** *(крычыць з бояззю):* Глядзіце, глядзіце хутчэй! Камень адкінуты!

***Марыя Магдалена*** *(з бояззю):* А там хтосьці ў белых адзеннях стаіць? *(Жанчыны схілілі твары да зямлі)*

***Анёл 1:*** Чаму шукаеце жывога разам з мёртвымі? Няма Яго тут ! Ён Уваскрос!

***Анёл 2:*** Прыпомніце, як вам гаварыў, калі яшчэ быў у Галілеі. “Трэба Сыну Чалавечаму быць выдадзеным у рукі грэшных людзей, і быць укрыжаваным, і на трэці

дзень уваскрэснуць.” *(пар. Лк 24)* ***Лектар:*** Жанчыны з радасцю вярнуліся ад магілы і паведамілі аб гэтым вучням Езуса.

***Анёл:*** Вось гэта і ёсць Добрая Навіна для вас, жыхары Зялёнага Луга. Езус прынёс нам новае жыццё. Ён перамог смерць і адчыніў нам Неба, гэта дом нашага Творцы. І таму сёння так радасна. І сонейка цёпла свеціць, уся прырода радуецца. А вы, залацістыя кураняткі, маеце важную місію ў гэтым часе.

***Куранятка 1*** *(з гонарам):* Мы, залацістыя кураняткі, падобныя да сонейка. Але мы не ўмеем лятаць, каб быць у небе.

***Анёл*** *(з усмешкай):* Але ж не такая ваша місія на планеце Зямля. Вам трэба нагадаць людзям, што ёсць новае жыццё. Добра аб гэтым кажа спосаб, у які вы з'яўляецеся на свет.

***Куранятка 2:*** Мы, залацістыя кураняткі, вылупляемся з яйка. Трэскаецца абалонка і мы выходзім.

***Зайчык 1:*** Гэта значыць, што яйка носіць у сабе новае жыццё. А ці мы, маленькія зайчыкі, таксама маем місію на планеце Зямля?

***Анёл:*** Так, маеце. Вы, маленькія зайчыкі, з'яўляецеся сімвалам Пасхальных Святаў. Хоць вы, у гэтым святочным часе, прыносіце падарункі, але яшчэ вучыце людзей чуваць, каб іх зло не перамагло. Зайчыкі маюць доўгія вушы і добра чуюць, што адбываецца навокал.

***Зайчык 2:*** Нашыя доўгія вушы дапамагаюць нам пачуць крокі, надыходзячага ваўка і лісы, а таксама іншыя пагрозы. Калі гэта пачуем, дык хутка ўцякаем.

***Анёл:*** Сапраўды так. Сёння людзі не могуць пачуць крокі зла. Ім цяжка адрозніць дабро ад зла. Шмат людзей згубілася ў сучасным свеце. Таму вы вельмі патрэбныя, маленькія зайчыкі, каб нанова навучыць людзей быць чуйнымі і, каб яны мелі адкрытыя вочы і вушы. І тады людзям будзе лягчэй выбіраць дабро.

***Куранятка 3:*** Вялікі дзякуй табе, даражэнькі анёл, за Добрую Навіну! Цяпер мы разумеем нашую місію на планеце Зямля.

***Зайчык 3:*** Анёлы не толькі на Раство Хрыстова прыходзяць з Добрай Навінай, а таксама ў часе Пасхі аб'явілі ўсяму свету, што Езус жыве. Ён перамог смерць і Уваскрос, Алеллюя!

***Куранятка 1:*** Дарагі анёлак, прымі ад нас, жыхароў Зялёнага Луга, на радаснае Свята Пасхі незвычайны дар, сімвал новага жыцця велікоднае яйка. ***Пасхальная песня.***

*Аўтар: с. Таццяна Халапук*☺